MAY 2016 / BY

# Newsletter

**Community-led Urban Strategies in Historic Towns (COMUS)**

## СТАН СПРАЎ. ЛІЧБЫ

**Ґорыс (Арменія)**
План кіравання (завяршэнне напрыканцы траўня)

**Ґюмры (Арменія)**
План кіравання (завяршэнне напрыканцы траўня)

**Душэці (Грузія)**
План кіравання (завяршэнне напрыканцы траўня)

**Жоўква (Украіна)**
План кіравання (завяршэнне напрыканцы траўня)

**Луцк (Украіна)**
План кіравання (завяршэнне напрыканцы траўня)

**Мстислав (Беларусь)**
ПТФ (завяршэнне напрыканцы траўня)

**Прылукі (Украіна)**
План кіравання (завяршэнне напрыканцы траўня)

**Сарока (Малдова)**
План кіравання (завяршэнне напрыканцы траўня)

**Чыатура (Грузія)**
План кіравання (завяршэнне напрыканцы траўня)

## АСНОЎНЫЯ ПАДЗЕІ

У студзені 2016 г. Еўрапейская камісія правяла 2-**е пасяджэнне Кіруючага камітэту ў Брусэлі**. У ім прынялі ўдзел нацыянальныя каардынатары з Арменіі, Грузіі, Рэспублікі Малдова і Украіны, а таксама вядучы эксперт Комус, прадстаўнікі Рэгіянальнай праграмы суседства ЕС "Усходняе партнёрства", Рады Еўропы, Арганізацыі гарадоў Сусветнай спадчыны і Праграмы ЕС "Усходняе партнёрства "Культура і крэатыўнасць". На пасяджэнніі разглядалася прамежкавая справаздача аб дзейнасці, становішчы спраў у краінах-удзельніцах праекта COMUS і планы дзеянняў на этапе планавання і рэалізацыі праекта.

У Радзе Еўропы былі зроблены новыя прызначэнні ў кіраўніцтве праекта COMUS. Спадар Хакан Шэрар Дземір быў прызначаны на пасаду адказнага адміністратара. Яму дапамагаюць спадарыня Андрэа Радрыгес Перэс у пытаннях візуалізацыі і . спадарыня Ірма Дзанковіч-Арслан, якая адказвае за фінансавыя і лагістычныя пытанні.

На сённяшні час усе краіны–удзельнікі COMUS стварылі **механізм кіравання** для рэалізацыі праекту. Было арганізавана некалькі экспертных місій. Да прыкладу, спадар Філіп Стэйн, вядучы эксперт COMUS у сакавіку 2016 г. наведаў Арменію па яе просьбе, а прадстаўнік Сакратарыяту Рады Еўропы у красавіку гэтага ж года быў з місіяй ў Беларусі.

Другі рэгіянальны семінар адбыўся ў г. Кішынёве і г. Сарока (Рэспубліка Малдова) . У ім удзельнічала 32 чалавекі з 9 пілотных гарадоў. Усе ўдзельнікі актыўна і натхнёна працавалі. Акрамя аналізу вынікаў стадыі планавання і інфармавання аб стадыі рэалізацыі праекта, у ходзе семінара адбыўся жывы абмен думкамі паміж прадстаўнікамі пілотных гарадоў, што стварала адчуванне існавання шырокай сеткі, якую праект імкнецца развіваць і ўзмацняць.

**Намаганні па забеспячэнню большай папулярызацыі праекта** COMUS будуць павялічаны. Яны мяркуюць пастаяннае абнаўленне навінаў на дзеючым веб-сайце праекта, размяшчэнне на ім прома паштовак з пілотных гарадоў, стварэнне кароткіх рэкламных ролікаў пра асобныя цікавыя месцы, а таксама выданне буклетаў, адукацыйных і інфармацыйных матэрыялаў у гарадах. **Запрашаем прадстаўнікоў пілотных горадоў рэгулярна заходзіць на сайт праекта і пастаўляць карысную інфармацыю аб яго развіцці на месцах.**

Стадыя планавання будзе завершана ў канцы траўня, пасля чаго наступіць стадыя рэалізацыі праекта , якая завершыцца ў снежні 2016 г. Асноўныя рэкамендацыі па яе ажыцяўленні былі накіраваныя ўсім нацынальным кардынатарам COMUS.

## НАСТУПНЫЯ КРОКІ

**Трэці практычны семінар** па пытаннях **гарадскога планавання** мяркуецца правесці напрыканцы чэрвеня.

**Першая навучальная паездка** запланавана ў Германію напрыканцы ліпеня. Яна будзе прысвечана пытанням далучэння мясцовых супольнасцей да працэсу кіравання культурнай спадчынай.

**Планы дзеянняў** для стадыі рэалізацыі праекту павінны быць складзены ў пачатку чэрвеня.